*ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА*

***Тэма:*** **Правапіс вялікай і малой літар**

***Тып урока:*** *паглыбленне і сістэматызацыя ведаў.*

***Падыходы, метады і прыёмы, якія выкарыстоўваліся на ўроку:*** асобасна-арыентаваны і сацыякультурны падыходы, праблемны метад, метад праектаў, метады вучнёўскага самавызначэння і рэфлексіі (“Завяршы фразу”), інтэрактыўныя метады (“Ланцужок пажаданняў”), гульнёвыя метады (бліц-турнір і віктарына), слоўныя метады (слова настаўніка і гутарка), практычныя метады (самастойная работа, дыктант з працягам), прыёмы параўнання і супастаўлення, самаправеркі.

***Мэты ўрока:***стварыць умовы для сістэматызацыі і паглыблення ведаў аб правапісе вялікай і малой літар; удасканальвання навыкаў напісання вялікай і малой літар паводле арфаграфічных нормаў, у выніку чаго вучні выканаюць тэст.

***Задачы ўрока:***

*адукацыйная*

мяркуецца, што да заканчэння ўрока вучні павінны **будуць ведаць**:

- правілы напісання вялікай і малой літар;

**будуць умець:**

- правільна пісаць словы з вялікай і малой літар паводле арфаграфічных нормаў;
- аргументаваць выбар арфаграмы;

*развіццёвая*

- спрыяць фарміраванню навыкаў самакантролю, умення планаваць сваю
дзейнасць;

*выхаваўчая*

- садзейнічаць павышэнню вучэбнай матывацыі на аснове далучэння вучняў да
ўласнага самавызначэння (скіраванасць на ўласны вынік урока); выхаванню ў вучняў любові да Бацькаўшчыны, роднай зямлі.

***Абсталяванне:*** падручнік; для падрыхтоўкі сваіх праектаў вучням прапаноўвалася працаваць з дапаможнікам па беларускай арфаграфіі: *Кулікові,У.І.* Сучасная беларуская арфаграфія. – Мінск, 2011*;* апорны канспект; тэставыя заданні; мультымедыйныя прэзентацыі (настаўніка і вучняў).

***Плануемыя вынікі ўрока:***

вучні ***будуць ведаць:***

- правілы напісання вялікай і малой літар;

***будуць умець:***

- правільна пісаць словы з вялікай і малой літар паводле арфаграфічных нормаў;
- аргументаваць выбар арфаграмы;
- супрацоўнічаць у камандзе; выступаць перад аўдыторыяй; працаваць у зададзеным тэмпе; прыцягваць свой уласны вопыт; аналізаваць, сістэматызаваць матэрыял; ажыццяўляць планаванне сваёй дзейнасці, самакантроль.